**Скірмунт Раман Аляксандравіч** (25.04.1868–7.10.1939) – беларускі і польскі грамадска-палітычны дзеяч, буйны землеўладальнік.

Паходзіў з беларускага шляхецкага роду Скірмунтаў.

Быў членам Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі (МТСГ), а ў 1904 г. быў выбраны ў члены Рады гэтага таварыства. Раман Скірмунт стаў верным сябрам, паплечнікам і, паводле слоў графа Іпаліта Корвін-Мілеўскага, «любімым вучнем» Эдварда Вайніловіча па гаспадарчай працы ў МТСГ і палітычнай дзейнасці.

У 1905–1911 гг. быў старшынёй Аддзела па справах сельскай гаспадаркі і патрэб Мінскага Палесся (Палескага таварыства сельскай гаспадаркі), што быў структурным аддзяленнем Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі.

Раман Скірмунт выступаў як адзін з ідэолагаў краёўцаў. У 1904 г. выдаў невялічкую брашурку «Голас мінуўшчыны і патрэба моманту. Становішча шляхты на Літве і Русі», дзе адзначаў кроўныя сувязі і адзінства паходжання шляхты ВКЛ і мясцовага сялянства.

Лідары Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі на чале з Эдвардам Вайніловічам даручылі Раману Скірмунту стварыць «краёвую партыю». У лістападзе 1905 г. Раман надрукаваў у газеце «Kurier Litewski» зварот «Краёвай партыі Літвы і Русі» – фактычна праграму партыі, якая патрабавала ўвядзення ўсіх дэмакратычных свабод і найперш свабоды нацыянальнага жыцця і роўнасці нацыянальнасцей Заходняга края, краёвага самакіравання, падкрэслівала прынцып недатыкальнасці прыватнай уласнасці. Аднак працэс стварэння «краёвай партыі» зацягнуўся.

У 1906 г. Раман Скірмунт па пратэкцыі Эдварда Вайніловіча быў абраны дэпутатам (ад Мінскай губерні) у І Дзяржаўную Думу Расійскай імперыі. У афіцыйных думскіх анкетных даных Раман Скірмунт запісаў сябе як «паляк». У дзяржаўнай Думе Скірмунт увайшоў у склад дэпутацкай групоўкі «Краёвае кола Літвы і Русі» (ці «Дэпутацкае кола Літвы і Русі», «Група заходніх ускраін»), якая аб'ядналася з дэпутатамі ад польскіх губерняў (г. зв. Польскім колам з Каралеўства Польскага) і склалі ядро парламенцкай групы «Саюза аўтанамістаў».

У І Дзяржаўнай думе (1906) Раман Скірмунт, як і іншыя члены «Краёвага кола Літвы і Русі», выступаў у абарону права прыватнай уласнасці на зямлю і супраць адчужэння часткі прыватнаўласніцкіх зямель: ён выказаўся, што стварэнне (па прапанове расійскіх кадэтаў) дзяржаўнага фонда зямель не вырашыць справу павелічэння (ці ўмацавання) сялянскага землеўладання, бо фонд будзе толькі прапаноўваць сялянам карыстанне зямлёй, а не валоданне, і ў Заходнім краі, дзе пануе падворнае сялянскае землеўладанне, выкліча толькі непаразуменне і жах; выступіў за продаж фонда дзяржаўных зямель сялянам.

У 1906 г. Скірмунт паўтарыў зварот аб стварэнні «краёвай партыі», змяніўшы толькі назву партыі – «Краёвая партыя Белай Русі і Літвы». Ён спланаваў праект «краёвай партыі» як міжнацыянальны блок польскай, беларускай і літоўскай палітычных арганізацый.

З 25 сакавіка 1907 г. Раман Скірмунт уваходзіў у склад Нагляднай рады Польскага таварыства «Асвета» ў Мінску.

17 чэрвеня 1907 г. у Вільні адбыўся з'езд землеўладальнікаў шасці беларуска-літоўскіх губерняў, якія прынялі нарэшце рашэнне аб стварэнні «Краёвай партыі Літвы і Беларусі». Аднак сам Скірмунт не ўвайшоў у партыю, яго не задавальняла тое, што «краёвая партыя» ўзнікала як выключна «польская», а Р. Скірмунт імкнуўся стварыць партыю, якая мела б тры фракцыі – польскую, літоўскую і беларускую. У выніку Краёвую партыю Літвы і Беларусі ўзначаліў сам галоўны лідар краёўцаў-кансерватараў Эдвард Вайніловіч.

З кастрычніка 1910 г. да студзеня 1911 г. быў сенатарам – дэпутатам Дзяржаўнага савета Расійскай імперыі, куды Скірмунт быў выбраны тэрмінам на тры гады ад Мінскай губерні па пратэкцыі Эдварда Вайніловіча. У афіцыйных анкетных даных Раман Скірмунт запісаў сябе як «паляк» і ўказаў, што скончыў гімназію ў Рызе. Аднак пры праверцы Раман Скірмунт не змог дакументальна пацвердзіць сваю заяву, што атрымаў гімназічную адукацыю. А для заняцця пасады дэпутата Дзяржаўнага савета Расійскай імперыі трэба было паводле заканадаўства адпавядаць маёмаснаму і адукацыйнаму цэнзу – мінімум мець гімназічную адукацыю. У выніку ў студзені 1911 г. Скірмунт быў вымушаны пакінуць пасаду дэпутата Дзяржаўнага савета Расійскай імперыі ад Мінскай губерні, а замест Рамана Скірмунта ў 1911 г. у Санкт-Пецярбург даслужыць у 1911–1912 гг. трохгадовую кадэнцыю (1910–1912) паехаў Караль Незабытоўскі, які ў 1910 г. на выбарах дэпутатаў ад Мінскай губерні атрымаў другое месца пасля Рамана Скірмунта.

Уваходзіў у склад праўлення Віленскага зямельнага банка. З 1911 г. быў гласным Мінскага губернскага земства. З 1914 г. быў членам Мінскага губернскага камітэта Усерасійскага земскага саюза, у 1917 г. – загадчыкам Мінскага губернскага харчовага камітэта.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ